СЕНЬНЯ ПАЧЫНАЕЦЦА ЧАЦЬВЕРТЫ КВАРТАЛ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

1 кастрычніка 1931 г.
№ 228 (1497)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Кладку вялікага фундаманту скончыць з посьпехам!

Сёньня прамысловасьць Савецкага Саюзу ўступае ў апошні, чацьверты квартал трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Трэці квартал быў кварталам пералому. У гэты час, на глебе правільнага ажыцьцяўленьня генэральнае лініі партыі, у барацьбе за рэалізацыю ўказаньняў Сталіна, партыя дабілася значных посьпехаў у выкананьні плянаў лёгкай прамысловасьці і ліквідацыі вялізарнейшага прарыву на транспорце.

Вялікія перамогі дасягнуты ў галіне будаўніцтва сродкаў вытворчасьці, аб чым сьведчыць выпуск Іжорскім заводам двух блюмінгаў, выпуск Сталінградзкім трактарным 100 трактароў у дзень і рад іншых перамог на фронце індустрыялізацыі краіны.

Транспорт, які дасягнуў вялікіх посьпехаў у параўнаньні з даваенным часам усё-ж яшчэ адставаў і адстае ад тых запатрабаваньняў, якія высоўвае перад ім пэрыод соцыялістычнай рэконструкцыі.

Чацьверты квартал павінен будзе адыграць рашаючае значэньне ў справе пасьпяховага завяршэньня фундаманту соцыялістычнай экономікі, у выкананьні ўсяго народна-гаспадарчага пляну 1931 году. У гэты-ж час рад асноўных галін прамысловасьці, як вугаль, мэталюргія і вытворчасьць будаўнічых матар'ялаў адстае і не дасягнуў патрэбнага пералому ў сваёй рабоце. Ва ўмовах Беларусі гэтымі галінамі зьяўляюцца тарфяная прамысловасьць, лясная, а таксама вытворчасьць будаўнічых матар'ялаў.

Тут паўстаюць вельмі адказныя задачы перад ленінскім комсамолам. Неабходна забясьпечыць выкананьне плянаў лёгкай прамысловасьці, г. зн. забясьпечыць палепшаньне абслугоўваньня рабочае клясы, забясьпечыць барацьбу за далейшыя, яшчэ больш ударныя тэмпы ў рабоце з тым, каб нагнаць упушчанае за мінулы час.

Неабходна забясьпечыць моцную базу для выкананьня гіганцкіх плянаў апошняга году пяцігодкі, г. зн., што ўсе сілы трэба кінуць на ліквідацыю прарыву ў Донбасе, забясьпечыць мобілізацыю рабочае сілы для вугальнай прамысловасьці. Гэта значыць, што неабходна дамагацца найхутчэйшага пуску гігантаў з ліку 518 (да якога адносіцца Крычаўскі цэмантны завод) і 1040. Гэта значыць забясьпечыць своечасовую вывазку торфу з тарфяных палёў, дамагацца поўнага выкананьня плянаў лесанарыхтовак і вывазкі лесу. Ня менш адказная задача, якая паўстае перад комсамолам, гэта—транспорт. Транспортны комсмол яшчэ не дабіўся пералому ў галіне выкананьня пляну асеньня-зімовых перавозак. Спараная язда на радзе вядучых вузлоў зрываецца. Ураўнілаўка яшчэ канчаткова ня зьнішчана як на транспорце, так і ў прамысловасьці.

Чацьверты квартал будзе баявым экзаменам для комсамолії: наколькі яна здолее кінуць свае сілы і правільна організаваць работу з тым, каб забясьпечыць выкананьне пляну гэтага кварталу, наколькі комсамол зможа паказаць прыклады практычнай рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна.

Трымаючы раўненьне на перадавыя атрады і зьвеньні ленінскага комсамолу, як восьмая ўдарная істужка (Віцебск), як цягнікі імя „Комсамольскай праўды" і „Чырвонай Зьмены",—правільна організаваць сваю работу і з посьпехам закончыць кладку фундаманту соцыялістычнай экономікі.

За 6 указаньняў тав. Сталіна, за тэмпы плюс якасьць, за новую хвалю ўдарніцкага руху—такава пуцёўка партыі для комсамола ў 4-ым завяршальным

ЛЕПШЫМ З ЛЕПШЫХ—ОРДЭН ПРАЦОЎНАГА СЬЦЯГУ

З ВІЦЕБСКУ. Цэкамол. Рэдакцыі „Чырвоная Зьмена"

28-га а 2 гадз. 15 хв.

Прамфінплян трэцяга кварталу восьмая комсамольская істужка фабрыкі „Сьцяг Індустрыялізацыі" выканала 28-га а 2-й гадз. 15 хв.

Сакратар камітэту ЛКСМБ Эпштэйн

ВОСЬМАЯ КОМСАМОЛЬСКАЯ ІСТУЖКА „СЬЦЯГУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ"

Выпіска з протаколу паседжаньня бюро ЦК ЛКСМБ ад 28-IX 1931 г.

Слухалі: матар'ялы аб прадстаўленьні да ордэна Чырвонага Працоўнага Сьцягу восьмай ударнай комсамольскай істужкі фабрыкі „Сьцяг Індустрыялізацыі" (Віцебск).

Ухвалілі: прасіць прэзыдыум ЦВК БССР за лепшую ўдарную працу ўзнагародзіць восьмую комсамольскую істужку Віцебскай фабрыкі „Сьцяг Індустрыялізацыі" ордэнам Чырвонага Працоўнага Сьцягу.

Сакратар ЦК ЛКСМБ Гуткін.

ПАРАВОЗ СЭРЫІ Щ—432 і Э—44

Выпіска з протаколу паседжаньня бюро ЦК ЛКСМБ ад 28-IX 1931 г.

Слухалі: матар'ялы аб прадстаўленьні да ордэну Чырвонага Працоўнага Сьцягу ўдарных комсамольскіх паравозаў імя „Комсомольской Правды" і „Чырвонай Зьмены" сэрыі Щ—432 і Э—44.

Ухвалілі: за лепшую ўдарную і прыкладную работу паравозных брыгад ударных комсамольскіх паравозаў сэрыі Щ—432 і Э—44 імя „Комсомольской Правды" і „Чырвонай Зьмены" прасіць прэзыдыум ЦВК БССР узнагародзіць гэтыя паравозы ордэнам Чырвонага Працоўнага Сьцягу. І ўзнагародзіць з паравозных брыгад пэрсанальна таварышоў: Мартыненка, Казарынава, Самсонава, Башкова, Дзергача, Скорагарбатага, Маторына, Будзько і Каралёва пачотнай граматай ЦВК БССР.

Сакратар ЦК ЛКСМБ Гуткін

Ўказаньні Сталіна ў цэхах

Чырвоная Зьмена на „Полымі Рэволюцыі"

Ад справы аднаго майстра да справы ўсяго рабочага колектыву

15 ліпеня 1931 году—гэта тэрмін, калі завод „Полымя рэволюцыі" ад сходаў і гутарак, аб гаспадарчым разрахунку перашоў да яго практычнага ажыцьцяўленьня.

Зараз цэхі ў асноўным увайшлі ў жорсткія гаспадарчыя рамкі складзены дагаворы між начальнікамі цэхаў, дырэктарам заводу і брыгадамі, што дае сябе адчуваць на працы ўсяго заводзкага мэханізму, пачынаючы ад максімальнага скарыстаньня старых матар'ялаў, дэталяй, якія раней ішлі на звал, да найбольш рацыянальнага скарыстаньня рабочай сілы, у якой завод адчувае з ачны недахоп.

З пераходам на гаспадарчы разрахунак прамфінплян цэху стаў нечым больш сталым. На адну адзінку рамонту дырэкцыяй заводу вызначаецца пэўная сума грошай, якую цэх не павінен перавысіць. Раней пры рамонце вагона на месца зламанай пружыны абавязкова заказвалі новую, што каштавала каля 8-мі рублей, зараз старыя сапсаваныя пружыны ідуць на электрозварку і, пасьля выпрабаваньня пад прэсам, пушчаюцца ў работу. А гэта каштуе ўсяго паўтара руб. У кавальным цэху пры заганах якой—небудзь дэталі раней абавязкова рабілі новую. Зараз пры малейшай магчымасьці сапсаваная дэталь ідзе на падварку, у рамонт. У выніку—аграмадная экономія матар'ялаў і рабочай сілы.

Гэткая праца стала неабходнай у гаспадарча-разрахунковым цэху, бо інакш цэх ня здолее выканаць дагавор.

Але пры такіх умовах сапраўды гаспадарчага разрахунку жорсткая экономія сродкаў [illegible] адзінай, бо рабочыя адчулі настойлівую неабходнасьць укласьціся ў пэўныя рамкі, адчулі кантроль рублём.

Над выявай балюча адбіваюцца праца гаспадарча-разрахунковых цэхаў [illegible]. Часьцей за ўсё гэта вынік [illegible] мэханізму заводу. Найдаўжэй прышлося перавыканаць прамфінплян таварнага цэху з-за несвоечасовай падачы вагонаў у рамонт. У дрэваапрацоўчым цэху быў прарыў у выкананьні прамфінпляну, у асноўным з прычыны недахопу піламатар'ялу, з-за гэтага сарваўся выраб станкоў для вагаў заводу „Ударнік".

Яшчэ і зараз добраякасныя балты з зусім нязначнымі недахопамі ідуць на звал. А завод адчувае ў іх значны недахоп.

У ажыцьцяўленьні гаспадарчага разрахунку яшчэ шмат недахопаў. Гаспадарчы разрахунак не стаў яшчэ справай усяго рабочага колектыву заводу і зараз застаўся толькі справай начальніка цэху, майстра, які непасрэдна складаў дагавор.

У выніку зараз надзвычай туга ідзе перавод брыгад на гаспадарчы разрахунак. Дагэтуль на заводзе няма ніводнай гаспадарча-разрахунковай брыгады.

У галіне зьнішчэньня недахопаў неабходна рэалізаваць прапанову аб увядзеньні кніг браку для рэгістрацыі якасьці вырабу у цэх. Гэта будзе спрыяць яшчэ большаму зьніжэньню працэнту браку.

Комсамольскі колектыў заводу „Полымя рэволюцыі" павінен стаць ініцыятарам пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак. Організаваная чырвоназьменаўская брыгада па ажыцьцяўленьню гаспадарчага разрахунку павінна зараз узмацніць сваю працу ў напрамку вывучэньня і практычнага ажыцьцяўленьня пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак.

У чацьверты квартал завод павінен прыйсьці з маладзёжнымі гаспадарча-разрахунковымі брыгадамі.

Дарафееў, Галаўня Ш.

„СЬВЕТ—СЬВЕДКА НЯЧУВАНАЙ АГІТАЦЫІ СУПРОЦЬ СССР"

Рыхтуючы крываваю бойню, капіталістыя разгарнулі шырокую кампанію паклёпаў на Савецкі Саюз"—так заяўляе Дмоўскі

„Откровение" Дмоўскага

ВАРШАВА. Надаўна ў Варшаве выйшла ў сьвет новая кніга Рамана Дмоўскага пад назвай: „Пасьляваенны сьвет і Польшча". У кнізе гэтай сабраны рад артыкулаў Дмоўскага, друкаваных часткова ў 1930 і 1931 г. у польскай нацыянал-дэмократычнай прэсе. Аўтар кнігі—стары правадыр нацыянальнай дэмократыі, старшыня польскага нацыянальнага камітэту часоў імпэрыялістычнай вайны, былы міністр замежных спраў „новае Польшчы".

У прамове да сваёй кнігі, якая напісана ў бягучым годзе, Дмоўскі ўводзіць рад цікавейшых паведамленьняў. Першая частка гэтай прадмовы, якая адносіцца да Савецкага саюзу, мае інтарэс і заслугоўвае ўвагі.

Вось што піша ідэолёгічны правадыр польскага буржуазнага лягеру, антагоністы Пілсудзкага.

„Увесну мінулага году ўвесь сьвет стаў сьведкай нячуванага энэргічнай агітацыі супроць Савецкай Расіі. Было ясна, што мэта гэтай агітацыі—спровакаваць вайну.

Вайна з Расіяй, калі-б гэта не была вайна азіяцкая (г. зн. на тэрыторыі Азіі), павінна была-б весьціся перш за ўсё Польшчаю. Вось чаму не было вялікіх сумненьняў у тым, што кіраўнікі агітацыі імкнуцца ўцягнуць нашу дзяржаву ў вайну.

Аб гэтым сьведчыла, паміж іншым, раптоўнае завастрэньне савецка-румынскіх адносін, якое, калі-б яно перайшло на ўзброены конфлікт, пагражала-б уцягненьнем у яго Польшчы на падставе існуючага паміж Польшчай і Румыніяй вайсковага саюзу, а таксама з прычыны небясьпекі, якая ўзьнікла-б для нашых межаў, калі-б Румынія была пераможана Саветамі, адабраўшымі Бесарабію. Пазьней ужо намеры давесьці Польшчу да вайны з Расіяй былі выкрыты надта ясна, дзякуючы добра падрыхтаванаму выпадку на савецкае пасольства ў Варшаве, раскрытаму ўжо пасьля [illegible], калі агітацыя ў карысьць вайны заціхла.

Для ўсякага, хто хацеў бачыць рэчы такімі, якімі яны былі на самой справе, было ясна, што Саветы вайны не жадаюць, што яны жадаюць яе пазьбегчы, што яны згодныя пайсьці на вайну толькі калі-б былі спровакаваны. І таксама ясна было, што гэта вайна—выйграная, ці праіграная—была-б нішчэньнем для Польшчы.

Зацікаўлены гэтай дзейнасьцю я зрабіў усё, што толькі змог, для атрыманьня інформацый аб сапраўдных пружынах, аб тым, хто стаіць за ёй, якія яе матывы, якія вайны, да якой [illegible] моцна штурхалі. Калі я дастаткова ведаў, я падзяліўся часткай маіх ведаў з польскай грамадзкасьцю ў некалькіх артыкулах, якія пад назвай „Рускія справы" зьявіліся ў „Газэце варшаўскай". Артыкулы гэтыя выклікалі гучны водгук, як у Расіі, так і на Захадзе. Паказальна, што ніхто і нідзе не спрабаваў адхіліць маіх сьцьвярджэньняў аб агітацыі за вайну і аб яе крыніцах.

Мне здаецца, што артыкулы гэтыя да пэўнай ступені садзейнічалі зрыву гэтай вялізнай агітацыі". „К. З."

10 год катаргі за „сабатаж"

ВАРШАВА. 29. Акруговы суд у Львове прысудзіў за прыналежнасьць да украінскай вайсковай організацыі, за акты „сабатажу" аднаго абвінавачанага да 10 год, другога да 8 год і трох да 3 год катаржнай турмы.



Рэволюцыйныя рабочыя пратэстуюць супроць зьдзекаў над палітзьняволенымі

ПАРЫЖ. 29. Як паведамляе „Юманітэ", у нядзелю 27 верасьня польскія і французкія рэволюцыйныя рабочыя паладзілі перад памяшканьнем польскага пасольства дэманстрацыю пратэсту супроць зьдзекаў над палітзьняволенымі у Польшчы.

У пасольстве былі выбіты шыбы. 26 верасьня былі выбіты шыбы ў рэдакцыі польскай газэты „Дзеньнік польскі", якая выдаецца ў Парыжы.

Аб удзеле комуністых у соцспаборніцтве і ўдарніцтве на вытворчасьці

З пастановы прэзыдыуму і партколегіі ЦКК КП(б)Б

Праверка ўдзелу комуністых у соцспаборніцтве і ўдарніцтве паказвае, што комуністы на вытворчасьці ў асноўным знаходзяцца на перадавых позыцыях барацьбы за прамфінплян, стаяць на чале творчага энтузіязму рабочых мас, паказваюць узоры сапраўднай ударнай работы і зьяўляюцца ініцыятарамі рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

Прэзыдыум і партколегія ЦКК КП(б)Б лічаць зусім недапушчальным, калі на паасобных прадпрыемствах удзел комуністых у соцспаборніцтве і ўдарным руху дасягае толькі 65-70 проц., а на некаторых нават ніжэй (фабрыка „Дзьвіна"—49 проц., імя Лекерта—41 проц., у Віцебску „Чырвоны [illegible]"—42 проц. у Магілеве, чыгунка Жлобін—61 проц.—на 1-VI 1931 г.). Гэта зьвязана асноўным з [illegible] ў выкананьні пляну на паказаных прадпрыемствах.

Асноўнымі прычынамі такіх адмоўных зьяў зьяўляецца адсутнасьць сыстэматычнай выхаваўчай работы з боку фабрычна-заводзкіх ячэек, партколектываў і [illegible] у напрамку штодзённай мобілізацыі увагі усіх партыйцаў, комсамольцаў і рабочых на выкананьне вытворчых задач данай фабрыкі і заводу, на ўзначальваньне соцспаборніцтва і на [illegible] праверкі выкананьня кожным комуністам сваіх абавязкаў.

Прэзыдыум і партколегія ЦКК КП(б)Б катэгорычна папярэджваюць усіх комуністых, што іх партыйнасьць будзе ўзважана ў залежнасьці ад таго, наколькі кожны комуніст прымае актыўны ўдзел у соцыялістычных формах працы, наколькі ён праяўляе вялізарную настойлівасьць і дысцыплінаванасьць у выкананьні баявых заданьняў партыі і стаіць на чале актыўных рабочых мас.

Райкомам, РКК, партячэйкам неабходна перабудаваць сваю працу так, каб не толькі займацца [illegible] прарываў на вытворчасьці (прагулы, брак, невыкананьне прамфінпляну) і [illegible] рэпрэсіўных мер, а штодзённа мобілізоўваць і стаць на чале шырокіх партыйных і беспартыйных рабочых мас на ліквідацыю прарываў, на рэалізацыю прапаноў тав. Сталіна.

Старшыня ЦКК КП(б)Б Калінін.

Сакратар партколегіі ЦКК КП(б)Б Суханава.

Агляд друку

(Зьмешчаны у „Комсамольскай Праўдзе" №280)

Спосаб, чужы бальшавіцкаму друку

„Мы зьвяртаемся да вас, комсамольцаў, беспартыйнай моладзі і рабочых сьвінагадоўчых саўгасаў Саюзу, з заклікам—ўзбройцеся шасьцю маршрутамі, зрабеце іх асноўнымі вагарамі ў барацьбе за сьвіньню, за вырашэньне мясной проблемы".

Так пісалі маладыя рабочыя сьвінагадочага саўгасу імя „Комсомольскай правды", які знаходзіцца ў Аршанскім раёне (Беларусь).

Іх зварот да ўсіх комсамольцаў, рабочае моладзі і рабочых сьвінагадоўчых саўгасаў СССР быў апублікаваны 2 верасьня ў № 212 нашай газэты.

Адказваючы рэальнай жывой справай на зварот ЦК УсеКП(б) і СНК аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі, моладзь саўгасу імя „КП" паставіла вельмі конкрэтную і вельмі важную задачу—давесьці кожны апарос у шасьцімесячным узросьце да аднае тоны.

Вялізарнае значэньне гэтай задачы зразумела для кожнага, хто хаця няшмат знаёмы з сьвінагадоўляй. Агуль на вядома, што сьвіньня—найбольш пладавітая хатняя жывёла, якая дае прыплод сам-7-12 за год, Але ўся справа ў тым, што з-за недастачы догляду каля 30-40% апаросу не выжывае і гіне, не дацягнуўшы да 2-3 месяцаў. У саўгасе імя „К. П." і ў радзе іншых не радавых саўгасаў цэлай сыстэмай мерапрыемстваў, зьвязаных з аўладаньнем тэхнікай буйнай сьвінагадоўлі, поўнасьцю давездена магчымасьць стопроцантнага захаваньня і выходжваньня апаросу, пры якім вага яго пры шасьцімесячным узросьце будзе роўна ня менш чым тоне. З выкладам гэтай сыстэмы мерапрыемстваў і выступіў саўгас імя „К. П." на старонках нашай газэты.

Заява энтузіястых жывёлагадоўлі, падмацаваная паказам тых шляхоў, па якіх ідзе іх барацьба за тону—апарос, ня была фэйервэркавым пошугам. У процэсе штодзённай работы саўгас імя „К. П." давёў усю мэтазгоднасьць намечаных ім мерапрыемстваў і вялізарную значнасьць пачатага паходу. Надрукаваўшы адозву комсамольцаў гэтага саўгасу, наша газэта зьвярнулася з заклікам да ўсіх рабочых сьвінагадоўчых саўгасаў разгарнуць усесаюзнае спаборніцтва за „тону-апарос"

Здавалася-б, што гэты дзелавы пачатак саўгаснае моладзі цанінна была перш за ўсё падхапіць беларуская комсамольская газэта „Чырвоная „Зьмена". На жаль, гэтага ня сталася. Больш таго: газэта „Чырвоная Зьмена" ўступіла ў гэтай справе на шлях цалкам недапушчальны для бальшавіцкай газэты.

Сумная гісторыя, якая здарылася з „Ч. З.", заслугоўвае таго, каб абставіны справы расказаць па парадку.

Калі аб лёзунгу саўгасу імя „КП" і аб заклікў кінутым ім на старонках „Комсомольской Правды", стала вядома аршанскаму райкому партыі, ён склікаў раённую нараду трыкутнікаў усіх саўгасаў і прадстаўнікоў колгасаў Прысутнічалі на гэтай нарадзе таксама і сэкратары комсамольскіх ячэек, рэдактары насьценных газэт і прадстаўнікі раённай газэты „Ленінскі прызыў". Рэзолюцыя была кароткая: вопыт саўгасу імя „К. П" перанесьці ва ўсе саўгасы і колгасы раёну.

Аб гэтым вопыце гаварылі ня толькі ў адным Аршанскім раёне. Партыйная нарада сэкратароў райкомаў партыі, старшынь рыкаў і заг. райза 30 жывёлагадоўчых раёнаў Беларусі ўхваліла пачын саўгасу „КП", абавязалася яго популярызаваць і, што важней усяго, рэалізаваць.

Такім чынам лёзунг „тона апарос і ня менш" атрымаў прызнаньне, падтрыманьне і правы грамадзянства ў жывёлагадоўчых саўгасах і колгасах Беларусі.

Аднак, увесь гэты час „Чырвоная Зьмена" захоўвала ўпартае маўчаньне аб лёзунгу „тона-апарос". „Чырвоная Зьмена" адмовілася даць пуцёўку гэтаму лёзунгу, выкліканаму да жыцьця ініцыятываю саўгаснага комсамолу.

Гэта маўчаньне цалкам адпавядала ўсім паводзінам „Ч. З." у пытаньнях жывёлагадоўлі. Наогул мясною проблемай газэта займалася ад выпадку да выпадку. На працягу двух з паловай месяцаў, з 1 ліпеня па 15 верасьня, акрамя дзьвёх падборак і апублікаваных з вялікім спазьненьнем рашэньняў ЦК Усе КП(б) і ЦК КП(б)Б аб разьвіцьці соцыялістычнай жывёлагадоўлі, газэта не знашла часу ні разу выступіць з разгорнутым матар'ялам па гэтаму пытаньню.

Толькі 20 верасьня, і то пасьля вельмі аўторытэтных рашэньняў партыйных організацый Беларусі, газэта вымушана была загаварыць аб жывёлагадоўлі.

Але як яна загаварыла? Калі меркаваць па „Ч. З.", гісторыя пачынаецца толькі з яе. Усё, што зроблена моладзьдзю і комсамолам да 20 верасьня, для газэты ня існуе. Ва ўсякім выпадку „Ч. З." з рэдкай упартасьцю робіць выгляд, што яна ня ведае, ня чула і ня бачыла дакумантаў аб пачыне саўгасу імя „КП", апублікаваных у друку.

„Чырвоная Зьмена" замоўчала сапраўдных ініцыятараў новага спаборніцтва, пачатага колектывам саўгасу імя „КП". Адным рухам пяра яна замацавала „ініцыятыву" ў спаборніцтве за Аршанскім раёнам у цэлым, ня гледзячы на тое, што ў гэтым раёне яшчэ і па сёньня частка сьвінагадоўчых саўгасаў і колгасных фэрм стаіць у баку ад барацьбы за тону-апарос.

Не жадаючы зрабіць пачын перадавікоў здабыткам кожнай комсамольскай ячэйкі саўгасаў і колгасаў, груба ігноруючы заклік ЦО УсеЛКСМ, выступіўшага 2 верасьня з разгорнутай праграмай дзеяньняў у барацьбе за тону-апарос, „Чырвоная Зьмена" дайшла да таго, што стала на абурлівы шлях простай фабрыкацыі фактаў.

Гутарка ідзе аб зьмешчанай 20 верасьня „адозьве рабочых сьвінагадоўчых саўгасаў, фэрм і колгасьнікаў Аршанскага раёну", друкуючы якую „Ч. З." паведаміла, што яна прынята на нарадзе аршанскага трыкутнікаў саўгасаў і СТФ.

Аб якасьці гэтай „адозвы" мы скажам ніжэй. Гвозд пытаньня ў тым, што кожны ўдзельнік Аршанскай нарады, прачытаўшы „адозву", ня мала зьдзівіцца, бо нарада ніякай адозвы ня пісала, не абгаварвала і не зацьвярджала.

Увесь гэты сумны дакумант быў цалкам выдуманы і з пачатку да канца напісан самімі рэдакцыйнымі працаўнікамі „Ч. З.", бяз ценю якога колечы ўдзелу ў гэтай справе тае нарады, імем якое падпісана ілжэ-„адозва".

Узьнікае законнае пытаньне:

— Адкуль узяла рэдакцыя „Ч. З." падобны мэтод „работы"?

Ні меней законна і другое пытаньне:

—З якіх пасуджваных выходзячы рэдакцыя „Ч. З." стала на шлях фабрыкацыі дакумэнта.

Да рэчы трэба адзначыць, што і гэты сфабрыкаваны рэдакцыйнымі працаўнікамі дакумэнт ёсьць не пазбаўлены паказчых таго, як умее „Ч. З." ставіць пытаньні барацьбы за жывёлагадоўлю.

Напрыклад, у „адозьве" ні слова ня сказана аб комсамоле, аб яго месцы ў барацьбе за тану—апарос. Калі дзеля таго, каб пасьпяхова рэалізаваць абавязацельства па давядзеньню кожнага апаросу ў шасьцімесячным узросьце да тоны, трэба ісьці ў сваёй рабоце па шляхі „узброеных шасьцю маршрутамі", —пакаханых у артыкуле праф. Багаеўскага, то „Ч. З." наогул не памятае аб гэтых шасьцёх маршрутах. Усе мерапрыемствы па барацьбе за тану—апарос „Ч. З." зводзіць выключна да:

„... палепшаньня абслугоўваньня сьвіней і догляду за імі, поўнага выкарыстаньня ўласных гаспадарак на вылучэньне сьвіней, прэміяльнай аплаты працы, поўнай ліквідацыі абязлічкі, усвоеньня тэхнікі сьвінагадоўлі".

Вось і ўсё! Куды падзеліся пытаньні [illegible], паход за ўкараненьне ў саўгасы самакармушак, самапаілак, механізаванае варыленьне сьвіней, стварэньне кармовае базы, стопроцантная злучка, зьберажэньне ўсяго прыплоду сьвіней? Ні водзага радка аб гэтым вы ня знойдзеце ў „Ч. З.".

* * *

Мы пытаемся, што ўсё гэта азначае?

Трэба з усёй рэзкасьцю заявіць, што факт, допушчаны „Ч. З.", дыскрэдытуе ролю і значэньне комсамольскай газэты.

У гэтым факце сказалася, што ў рэдакцыі „Ч. З." знайшлі сабе месца гнілыя способы і мэтоды газэтнай работы, якія цалкам супярэчаць духу і прынцыпам бальшавіцкага друку.

Мусіць у даным выпадку чужыя для нас прынцыпы конкурэнцыі зацямілі ў розуме работнікаў „Ч. З." сузнаньне партыйнай адказнасьці за даручаную ім справу.

Вось дзяць так, што „Ч. З." упарта замоўчвала па колгасу імя „К. П." толькі таму, што гэты пачын быў упершыню падхоплены і апублікаваны не „Чырвонай Зьменай", а іншай газэтай.

Выходзіць так, што, сьлепуючы тым-жа гнілым прынцыпам конкурэнцыі, „Ч. З." „у піку" гэтаму пачыну „організоўвае", так сказаць, контрпачын у выглядзе „ініцыятывы аршанскай нарады", фабрыкуючы сваю „ініцыятыву", ня выходзячы са сьцен рэдакцыі.

Такім чынам, менш усяго думаючы аб сваіх задачах—задачах комсамольскай газэты ў барацьбе за развіцьцё соцыялістычнай жывёлагадоўлі—і цалкам жаданьнем „залаціць бляск свайму мундзіру гонару", у пагоні за „арыгінальнай ініцыятывай", „Ч. З." стала на шлях, чужы нашаму друку.

А дзеля гэтага ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ патрабуе ад сваіх рашэньняў даць адпаведную ацэнку падобным мэтодам работы рэдакцыі „Ч. З.", забясьпечыўшы бальшавіцкае высьвятленьне праблем соцыялістычнай жывёлагадоўлі.

АД РЭДАКЦЫІ „Ч. З."

Мы цалкам згодны с крытыкай недахопаў нашай работы па сьвінагадоўлі ў той яе частцы, дзе гаворыцца, што „Ч. З." з 1 ліпеня да 15 верасьня не вяла разгорнутай глыбокай работы, каб мобілізаваць комсамольскую арганізацыю на конкрэтных, вадучых лёзунгах барацьбы за выкананьне рашэньняў партыі аб разьвіцьці сьвінагадоўлі. Згодныя і з тым, што да 15 верасьня „Ч. З." не разгарнула шырокай работы па рэалізацыі заклікаў ЦО УсеЛКСМ „К. П." на барацьбу за тону мяса з апаросу ў шасьцімесячным узросьце. За апошні час мы ўжо ўзяліся за конкрэтныя захады, каб выправіць гэтыя прабелы ў рабоце. У тры раёны мы накіравалі сваіх працаўнікоў, якія практычна дапамогуць КСМ арганізацыям распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы ў барацьбе за сваечасовае скончэньне будаўніцтва сьвінарнікаў, комплектаваньня гурту і ўключэньня ва ўсесаюзнае спаборніцтва за „тону-апарос" саўгасаў і колгасаў арганізаваны пасты „Чырвонай Зьмены".

Прыняты меры, каб популярызаваць вопыт работы комсамольскай ячэйкі саўгасу імя „Комсамольскай праўды", былы „Дзедзелава", якая ў БССР зьяўляецца ініцыятарам у барацьбе за тону мяса з апаросу ў шасьцімесячным узросьце (ужо зьмешчаны рад матар'ялаў і падрыхтаваны да зьмяшчэньня). Мы заклікаем усю комсамольскую організацыю па-баявому ўключыцца ў выкананьне праграмы ЦК КП(б)Б па сьвінагадоўлі і пастановы ЦК ЛКСМБ аб уключэньні ва ўсесаюзнае спаборніцтва за „тону-апарос". „Чырвоная Зьмена" і ўся комсамольская організацыя Беларусі павінны па-баявому выправіць адзначаныя ў „К. П." недахопы ў барацьбе за развіцьцё соцыялістычнай жывёлагадоўлі і біцца за рэалізацыю шасьці маршрутаў комсамольскай ячэйкі саўгасу імя „К. П." і проф. Багаеўскага, якія высунуты на старонках „К. П." ад 2-го верасьня.

Аднак, мы катэгорычна адвяргаем беспадстаўныя і безадказныя абвінавачваньні „Ч. З." у „спосабе, чужым бальшавіцкаму друку" і ў „фабрыкацыі ілжэ-адозвы" ад імя нарады трыкутнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў, колгасаў і фэрм Аршаншчыны. Адозва, вытрымка з якое ў радзе аддзельных работ гэтай нарады была зьмешчана ў „Ч. З." 20 верасьня прынята нарадай трыкутнікаў Аршаншчыны, на якой удзельнічаў наш прадстаўнік. Гэта адозва нарады трыкутнікаў была поўнасьцю зьмешчана ў аршанскай газэце „Ленінскі прызыў" ад 15 верасьня №101.

ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ для высьвятленьня гэтай справы выдучылі камісію, вывады якое будуць зьмешчаны ў бліжэйшы час

Дзе рулявыя не на сваіх мясцох,
Там няма піонэрскай работы, замест росту ідзе адліў з піонэратрадаў

Піонэрская організацыя БССР за пэрыод пасьля X зьезду ЛКСМБ і 2-га ўсебеларускага піонэр-зьлёту дабілася вялізарных дасягненьняў, дапамагаючы партыі і комсамолу ў барацьбе на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва.

Аднак прыходзіцца констатаваць, што рашэньні IX зьезду УсеЛКСМ аб тым, што „кіраўніцтва камітэтаў і ячэек комсамолу піонэрработай да гэтага часу застаецца нездавальняючым, асабліва ў галіне падбору і падрыхтоўкі работнікаў" па-сёньня застаецца ў сіле.

Рад ячэек і камітэтаў (аб якіх часткова гаворыць сёньнешні матар'ял) „не забясьпечылі сапраўднага павароту саюзу да комуністычнага выхаваньня піонэрскай організацыі.

Мы патрабуем ад Слуцкага, Горацкага. Петрыкаўскага і Круцкага райкомаў комсамолу палепшыць кіраўніцтва піонэр-рухам і неадкладна паведаміць аб прынятых захадах да тых ячэек, якія ігноруюць кіраўніцтва піонэр-організацыяй.

Да суровай адказнасьці!

Здавалася, што пасьля другога ўсебеларускага піонэрскага зьлёту піонэрскі атрад пры Камаровіцкай ячэйцы комсамолу па-ўдарнаму возьмецца за выкананьне пастаўленых зьлётам задач. Аднак, мы наглядаем зусім адваротнае.

Атрад на працягу паўтара месяцаў ні разу ня збіраўся, рашэньні зьлёту не абгавораны.

Замест ударнага ўцягненьня працоўнай дзетвары, наглядаецца вялікі адсеў піонэраў з атраду.

З 50 чал. у атрадзе засталося толькі 30. Такі ганебны адсеў тлумачыцца права-опортуністычнай практыкай комсамольскай ячэйкі Камаровіч.

Удзел піонэраў у гаспадарча-палітычных кампаніях не адчуваецца.

Ня лепш справа ў піонэрскім атрадзе пры колгасе „Савецкая Беларусь" (в. Фастовічы). Атрад з часу зьлёту ня вырас ні на аднаго чалавека.

Комсамольская ячэйка колгасу не кіруе піонэратрадам.

Петрыкаўскі РК ЛКСМБ павінен неадкладна прыцягнуць да суровай адказнасьці опортуністычнае кіраўніцтва комсамольскіх ячэек в. Камаровіч і „Савецкая Беларусь". якія разваліваюць піонэр-організацыю.

Грайзэль



Трывожныя сыгналы з Слуцку

Піонэрработа ў Слуцкім раёне ў поўным развале. Піонэратрады амаль ва ўсім раёне не працуюць. Пасьля пастановы другога ўсебеларускага зьлёту піонэраў у організацыі не распрацаваны

Ёсьць рад фактаў, калі атрады зусім разваліліся (атрад пры колгасе «Прамень комуны», саўгасвучу і інш.).

Райбюро ДКО разьехалася. Бюро РК ЛКСМБ с аёй бязьдзейнасьцю і опортуністычнай недаацэнкаю патурае развалу піонэрскай організацыі.

Прыбытак

Палітычна-няпісьменны навічок кіруе піонэратрадам

Мсьціская ячэйка комсамолу Бягомельскага раёну ніякай увагі не аддае піонэратраду, з-за чаго той зусім не працуе.

Ячэйка абмежавалася тым, што вылучыла на піонэрработу комсамольца-навічка, палітычна зусім няпісьменнага, які ня можа кіраваць піонэратрадам.

Не зварочвае ніякай увагі на стан піонэратраду і Бягомельскае райбюро ДКО. Ніводнага чалавека з РБ ДКО у атрадзе за час пасьля зьлёту ня было.

Бэненсон

Рыхтуем сапраўдную зьмену

Піонэрская база мястэчка Хойнікі Хойніцкага раёну разгарнула работу па перадачы лепшых піонэраў у комсамол. Да МЮД'у ў комсамол было перадана 9 чал., пасьля МЮД'у 6,

Без кіраўніцтва

Піонэратрад пры Авікаўскай ячэйцы Горацкага раёну зусім разваліўся, у атрадзе не засталося ніводнага піонэра. Такое ганебнае, недапушчальнае становішча склалася таму, што ячэйка і райбюро ДКО зусім не кіравала піонэратрадам.

Важаты атраду тав. Бухараў паехаў і пакінуў піонэраў без кіраўніцтва.

Горацкае бюро ДКО павінна неадкладна зацікавіцца становішчам піонэратраду і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

Дзераза

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ.

Усім членам і кандыдатам пленуму Менгаркому ЛКСМБ, сэкратарам гарадзкіх і вясковых камітэтаў, колектываў і ячэек Менскай організацыі ЛКСМБ

3-га кастрычніка 1931 г., роўна а 6-й гадз. увеч. у Доме Навукі і Тэхнікі (Комсамольская, 25) адчыняецца пашыраны пленум Менскага Гарадзкога Камітэту ЛКСМБ.

Парадак дня:

1. Вынікі манэўраў.
2. Вынікі ўборкі і асеньняга севу і задачы далейшага замацаваньня колгасаў.
3. Аб зімовай палітвучобе

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў пленуму, сэкратароў вясковых ячэек, сэкратароў і членаў бюро гарадзкіх камітэтаў, колектываў і ячэек ЛКСМБ абавязкова.

Сэкратар Менгаркому ЛКСМБ—Янковіч

Будаўніцтва распачата, а матар'ялаў няма

Аддзел кадраў ВСНГБ не адпусьціў будматар'ялаў для пабудовы Гомельскага будвучу Белдзяржбуду, прапанаваўшы Белдзяржбуду скарыстаць матар'ялы з іншых пабудоў. А калі некаторая колькасьць будматар'ялаў была перакінута з пабудовы маргаринавага заводу, дык па запатрабаваньню начальніка работ матар'яла заводу быў зьвернуты.

Гомельская комунгаспадарка некалькі раз мяняла вучасткі для пабудовы будвучу. Падрыхтоўка да будаўніцтва ўжо распачата. Колектыў КСМ арганізаваў суботнік для копкі катлавану і ліквідацыі прарыву на цагельным заводзе імя Дзяржынскага.

Далейшае будаўніцтва будвучу неабходна забясьпечыць будматар'яламі.

Бюро колектыву ЛКСМБ БДБуду

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Галоўлітбел № 599.

Друкарня імя тав. Сталіна.